# Краязнаўчая газета

№ 14 (559)
Красавік 2015 года

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by


## У нумары:


☞ **Неабыякавае:** *пра памылкі, іх тыражаванне і выпраўленне –* *стар. 2*

☞ **Небяспека:** *гіне «прыватны біты шлях» –* *стар. 3*

☞ **Вялікдзень:** *традыцыі святкавання і дзень сённяшні –* *стар. 4 і 7*





## На тым тыдні...

✓ **26 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася выстаўка **«“Пушкінскае гняздо” ў Вільні ў кантэксце культуры к. XIX ст. – пач. XX ст.»** з фондаў віленскага Літаратурнага музея А.С. Пушкіна. Яна знаёміць наведнікаў з домам-сядзібай Маркучай, якая з’яўляецца цэнтрам памяці пра паэта ў Вільні, а фотаздымкі дапамагаюць перанесціся больш чым на сто гадоў таму і пабачыць тагачасны ўклад жыцця, моду і звычкі Маркучайскай сядзібы. Дапоўняць літоўскую выстаўку рэчы канца XIX – пачатку XX ст. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі.

✓ **27 сакавіка** ў галерэі Беларускага саюза дызайнераў адкрылася **выстаўка Таццяны Лісавенкі «Таццяна і ТЭАТР»**. Т. Лісавенка – дызайнер адзення і сцэнічных касцюмаў. У экспазіцыі прадстаўленыя больш за пяцьдзясят яе эскізаў розных гадоў, некалькі інсталяцый з сапраўднымі касцюмамі са спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага і фатаграфіі любімых спектакляў.



*Светлавы калодзеж*

✓ **28 сакавіка** з ініцыятывы Літаратурнага музея Петруся Броўкі адбылася **аперацыя «Светлавы калодзеж»** – усе ахвочыя маглі паўдзельнічаць у вясенняй прыборцы сутарэнняў дома № 30 на вуліцы К. Маркса, дзе знаходзіцца музей.

Будынак музея мае доўгую гісторыю – пабудаваны як даходны дом, быў Другім Домам Саветаў, захаваўся пад час вайны. У 1980 г. у ім быў заснаваны музей-кватэра Петруся Броўкі. У пачатку XX ст. такое канструктыўнае рашэнне – калодзеж – было распаўсюджаным сродкам вентыляцыі і асвятлення лесвічных клетак. У Мінску засталося некалькі прыкладаў такога архітэктурнага рашэння.

✓ **28 сакавіка** ў Мінску прайшла **Міжнародная канферэнцыя «Моўныя правы і іх абарона»**, якую арганізавала «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны». Пад час мерапрыемства былі абмеркаваныя пытанні праблемаў моўнага заканадаўства, тэхналогіяў і практыкі грамадзянскай супольнасці па абароне лінгвістычных правоў, моўнай палітыкі і развіцця нацыянальных моваў.

✓ **31 сакавіка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася **персанальная выстаўка Уладзіміра Вішнеўскага «Будаўніцтва чалавека»**, прымеркаваная да 60-годдзя з дня нараджэння і 40-годдзя творчай дзейнасці аўтара.

«Гэта мае разважанні на тэму дуалізму чалавека – чалавека светлага, духоўнага і зямнога са сваімі страсцямі, – кажа У. Вішнеўскі. – Чалавек на працягу жыцця змяняецца ўнутрана і вонкава (душа-цела) – і гэта, натуральна, і ёсць бясконцае “будаўніцтва чалавека”, барацьба белага і чорнага (светлага і цёмнага)».

✓ **1 красавіка** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Музей гісторыі беларускага кіно» адкрылася прымеркаваная да Міжнароднага дня смеху **выстаўка «Лятучая, гаручая, празрыстая: гісторыя промыслу і барацьбы з ім у Беларусі»**.

Традыцыя самагонаварэння ў Беларусі вядомая з XV ст. Самагонка ў гісторыі нашай краіны станавілася як чыннікам гаспадарчага росту, так і сапраўдным бічом на шляху развіцця грамадства.

Экспазіцыя выстаўкі прэзентуе ўзоры самагонных апаратаў, атрыбуты, якія суправаджалі працэс самагонаварэння. Значную частку экспанатаў складаюць узоры савецкіх плакатаў антыалкагольнай накіраванасці.

Выстаўка падрыхтаваная сумесна з Беларускім саюзам дызайнераў, партнёрам праекта выступіў музейны комплекс «Дудуткі», які адраджае старадаўнія тэхналогіі і рэцэпты.




# Паход на Тужаўлянскі кар'ер

***На базе Верцялішкаўскай сярэдняй школы Гродзенскага раёна дзейнічае гурток «Юныя краязнаўцы», які наведваюць вучні 7 і 8 класаў. Гурткоўцы займаюцца вывучэннем гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй мясцовасці. У сакавіку з гэтай мэтай былі арганізаваны вандроўкі па фартах Гродзенскай крэпасці часоў Першай сусветнай вайны і паход на Тужаўлянскі кар'ер, размешчаны побач з аднайменнай вёскай.***

Маршрут: Верцялішкі – Санкаўшчына – Баяры – Тужаўляны – Тужаўлянскі кар'ер – рэшткі форта № 11 Гродзенскай крэпасці. Уся дарога ў абодва бакі склала 15 км, якія з улікам праведзенага часу на кар'еры былі пераадоленыя за 4 гадзіны.

Тужаўлянскі кар'ер размешчаны за 5,5 км ад Верцялішкаўскай школы. Яго глыбіня дасягае 10 – 12 м. Кар'ер досыць малады і вылучаецца прыгажосцю краявідаў. На яго прыкладзе вучні пазнаёміліся з асноўнымі структурнымі элементамі геалагічнага агалення.

Што тычыцца фартыфікацыйных збудаванняў, сёння размешчаных у межах сметніка побач з Путрышкамі (за 7,58 км ад нашай школы), то яны вельмі дрэнна захаваліся. Гэта рэшткі форта № 11 Гродзенскай крэпасці, сярод якіх на самым ускрайку сметніка вылучаецца высокая бетонная прамавугольная канструкцыя.

Сам жа сметнік даў дзецям яскравае ўяўленне пра адваротны бок чысціні і парадку на зямлі.

*Васіль ГЕРАСІМЧЫК,*
*настаўнік гісторыі Верцялішкаўскай СШ Гродзенскага раёна*



# На памылках не вучацца?

***Доўга стрымліваўся, каб не брацца за пяро. Але бясконцае нанізванне ўсё новых і новых дэталяў на хвалюючую мяне тэму ўрэшце перамагло маю нерашучасць. Гаворка пра асобныя старонкі нашай гісторыі. Нават мо не цэлыя старонкі, а асобныя факты, якія, здавалася б, ужо аддыскутаваныя і набылі сталы, пастаянны характар. Аднак...***

Час ад часу ў нашым цэнтральным друку (здараецца, і ў кнігах таксама) з'яўляюцца публікацыі, якія ўпэўнена, але бяздоказна, абвяргаюць тое, што стала набыткам шырокай аўдыторыі і прынялося як рэальная гістарычная з'ява. Тым не менш, у падобных публікацыях без абвяржэння ранейшых фактаў, без спасылак на новыя дакументы ці даследаванні проста, нібыта між іншым, называюцца факты, даты і падзеі, якія не адпавядаюць раней прынятай, у тым ліку гісторыкамі і даследчыкамі, канцэпцыі. Здаецца, практыка вымагае простага тлумачэння: чаму, у выніку чаго, якія знаходкі паўплывалі на замену звыклага новым. Але гэтага не адбываецца. Як жа тады паводзіцца чытачу? Каму верыць? Энцыклапедыям, даведачнай і гістарычнай літаратуры ці новаму паведамленню аўтара публікацыі? Асаблівая небяспека падобных публікацый бачыцца ў сувязі з тым, што і на самой справе нашая гісторыя ўсё яшчэ не пазбаўленая белых плямаў і не стала прадметам усеагульнага прызнання і шанавання.

Цытата з нядаўняй (2015 год) газетнай публікацыі (даруйце, шаноўны чытач, але прозвішчы аўтараў не буду называць, бо для мяне куды важней дакладнасць выкладзенага, а не магчымасць кінуць камень у агарод некага канктрэтнага).

*«Но в 1985 году польский историк Ежи Ахманьский нашёл завещание Софьи Гольшанской, составленное 29 июля 1518 года под Волковыском клириком перемышльской диоцезии Николаем Гусовским...»* Звернем увагу на дату: 29 ліпеня 1518 года.

А цяпер звернемся да «Беларускай энцыклапедыі»: Гальшанская Соф'я «1405? – 21.9.1461». Тое ж і ў энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае». Тады пытанне: як магло «завещание» Соф'і датавацца 1518 годам?

Яшчэ адна цытата, але з іншага выдання, амаль супадае па часе абнародавання. *«У лютым 1386 года 26-гадовы вялікі князь літоўскі Ягайла..., прыняўшы каталіцтва, ажаніўся з адзінаццацігадовай польскай прынцэсай Ядвігай і стаў, такім чынам, каралём Уладзіславам, заснавальнікам дынастыі Ягелонаў, якая правіла створанай дзяржавай амаль дзвесце гадоў».*

Тут ужо сапраўды змешаныя не толькі боб з гарохам.

Цытата з «Беларускай энцыклапедыі»: *«Ягайла (у праваслаўі Якаў, у каталіцтве Уладзіслаў; 1352? – 1.6.1434)»*.Тое ж і ў энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае», і ў абсалютнай большасці, калі не паўсюль, даведачнай і энцыклапедычнай літаратуры. Калі так, дык у 1386 годзе яму было 34 гады, а ніяк не 26. Калі ж гэта стала вядома ў выніку знаходак новых дакументаў, дык пра тое варта як мінімум згадаць.

Яшчэ адна цытата з «Беларускай энцыклапедыі»: *«Ядвіга (15.2.1374, г. Буда, Венгрыя – 17.7.1399, каралева Польшчы [1384 – 99], жонка караля Польшчы і вял. князя ВКЛ Ягайлы»*. Тое ж і ў энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае». Падлікі паказваюць, што на час шлюбу мела поўных 12 гадоў і была на той час каралевай польскай, бо да гэтага нарадзілася ў сям'і караля венгерскага і польскага Людовіка I Вялікага і жыла ўвесь час у Венгрыі, значыць, была прынцэсай венгерскай.

Што да дынастыі Ягайлавічаў-Ягелонаў, дык яна пайшла ад Ягайлы і ягонай чацвёртай жонкі Соф'і Гальшанскай, шлюб з якой адбыўся ў нашым Навагародку 24 лютага 1422 года.

І зусім для мяне незразумела, якой жа «створанай дзяржавай» «правіла» дынастыя Ягелонаў? Польскай? Дык жа Каралеўства Польскае існавала з XI стагоддзя, а Рэч Паспалітая – з XVI. Вялікім Княствам Літоўскім? А яно вядомае з сярэдзіны XIII стагоддзя. І яшчэ вядома, што Ягелоны былі каралямі не толькі ў Польшчы, а і ў Венгрыі, Чэхіі.

Звяртаюся да яшчэ адной публікацыі (2013 год) цытаванага мной першага аўтара. Шлюбаванне Ягайлы і Соф'і Гальшанскай.

*«17 и 71. Именно столько было молодожёнам, над которыми держали венцы в декабре 1421 года в Новогрудском костёле»*. Няхітрыя падлікі, і атрымліваецца, што Ягайла нарадзіўся ў 1350 годзе. Але ж і гэта не так. Праўда, дата шлюбу ў Навагародку для многіх застаецца спрэчнай. Аднак жа большасць даследчыкаў лічаць годам шлюбавання 1422-і. Праўда, адзін вядомы аўтар крыху раней за згаданы артыкул неназванага мной першага аўтара піша, што «и современники, и потомки считали брак Софьи и Владислава неравным: ему было около шестидесяти, ей – около семнадцати» (дзеля справядлівасці неабходна было б задаць шаноўнаму аўтару пытанне: а на чым, на якіх дакументах грунтуецца новая дата народзінаў Ягайлы?). Тым не менш, калі б неназваны мной першы аўтар знаёміўся з гэтай публікацыяй (яны надрукаваныя ў адным і тым жа выданні), то не мусіў бы вызначаць шлюбны ўзрост Ягайлы ў 71 год.

Вось і зусім нядаўна ў кнізе аднаго гродзенскага аўтара паведамляецца, што 74-гадовы Ягайла і 16-гадовая Соф'я пабраліся шлюбам. І Вітаўт нібыта звяртаўся да Сямёна Гальшанскага, а не Сямёна Друцкага, у якога на той час сапраўды жыла сям'я Соф'інай маці, бо яе муж і бацька Соф'і Андрэй Гальшанскі памёр, з просьбай аб шлюбе Соф'і і Ягайлы. Дарэчы, той жа аўтар згадвае пра сястру Соф'і Васіліcу, хоць на самой справе была і яшчэ адна сястра – Марыя.

А што да даты шлюбу, дык усё ж з амаль абсалютнай дакладнасцю можна згадзіцца з днём 24 лютага, я на гэты конт маю важкія доказы, ды і многія польскія даследчыкі называюць менавіта гэты дзень.

А вось наконт таго, што шлюбаваліся Ягайла і Соф'я – *«единственная королева-белоруска»*, як піша той другі газетны аўтар, можна паспрачацца, бо нацыянальнасць тады была яшчэ не моцна ідэнтыфікаванай. А раз так, то чаму нельга лічыць каралевамі з нашай зямлі дачку Гедзіміна Альдону (жонка будучага караля польскага Казіміра Вялікага) і Барбару Радзівіл – жонку караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста?

Не адпавядаюць рэчаіснасці і сцвярджэнні ўсё таго ж неназванага першага аўтара, што Ядвігу ў дзяцінстве *«посватали за венгерского королевича Вильгельма»* і што *«росли молодые люди вместе»*. Разам расці яны ніяк не маглі, бо Ядвіга, а не Вільгельм, сапраўды была каралеўнай венгерскай (яе бацька Людовік I Вялікі (Анжуйскі, Венгерскі) быў каралём венгерскім і польскім), а вось аўстрыйскі эрцгерцаг Вільгельм паходзіў з Габсбургскага роду. І пасля рытуальнага шлюбавання чатырохгадовай Ядвігі і пяцігадовага Вільгельма яны памяняліся месцамі жыхарства. Каб вывучыць мову будучага мужа, Ядвіга паехала ў Вену, а Вільгельм – у венгерскую сталіцу.

Нехта скажа – дробязі. А гэта як паглядзець. Памаладзіць ці састарыць чалавека, нешта яму дадаць альбо адняць, тым больш у дачыненні да дзяржаўнага дзеяча, без адпаведных доказаў і спасылак, толькі з-за свайго ўласнага жадання – справа няўдзячная. Гэта блытае не толькі карты гісторыі, але і выклікае недавер да гісторыяпісальнікаў нашай мінуўшчыны.

***Без крыўды на ўсіх руплівцаў на часам няпростай і не заўсёды шчодраўмалотнай ніўцы радзімазнаўства –***

*Анатоль БУТЭВІЧ*

*Спадчына ў небяспецы*

# «Прыватны біты шлях»

Я родам са Стоўбцаў. Побач з горадам знаходзіцца старажытная брукаванка, даўжыня якой прыкладна 2 – 2,5 кіламетра, захавалася ў вельмі добрым стане. У гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць. Стаўбцоўскі раён» яна згадваецца ў ліку сур'ёзных аўтамабільных і чыгуначных шляхоў раёна за 1939 г., падаецца як «палепшаная дарога Стоўбцы – Мір». Па ёй у свой час ездзіў наш славуты зямляк Уладзіслаў Сыракомля, які ў кнізе «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» называў яе як «прыватны біты шлях». Пабачыць гэтую шашу можна і на старых мапах першай паловы XX ст.

Яна карыстаецца папулярнасцю як у мясцовай моладзі, так і сярод турыстаў, якія потым дзеляцца сваімі ўражаннямі аб яе якасці і даўжыні ў сваіх блогах (асабліва пасля вандровак на роварах). Зусім побач знаходзіцца вёска Новы Свержань, дзе захаваліся касцёл Святых апосталаў Пятра і Паўла (1588), царква Успення Найсвятой Багародзіцы (1590), сінагога XIX ст. і нядаўна адкрытая аграэкасядзіба «Млын». У Стоўбцах захавалася шыкоўная царква 1825 г., гарадская забудова XIX і пачатку XX стст., шмат чаго звязана з «міжваенным перыядам». Зусім побач – Акінчыцы, калыска нашага песняра Якуба Коласа.

Гэты брукаваны шлях паводле ўспамінаў старажылаў злучаў Стоўбцы і Свержань з Мірам. Уявіце, які неверагодны турыстычны патэнцыял хаваецца тут, калі дбайна падысці і злучыць Стоўбцы, Свержань і Акінчыцы з Мірам і яго замкам пры дапамозе такога брукаванага шляху, на якім турыстычныя аўтобусы маглі б рабіць прыпынак, прапаноўваць пешыя маршруты. Патэнцыйна брукаваны шлях можа быць месцам правядзення масавых мерапрыемстваў, святаў, што адбываюцца ў горадзе, кірмашоў. Гэта быў бы вялізарны ўнёсак у развіццё аграэкатурызму і папаўнення мясцовага і дзяржаўнага бюджэтаў.

Але замест гэтага нядаўна стала вядома, што брукаваны шлях збіраюцца закатаць асфальтам (збіраюцца зрабіць аб'язную дарогу вакол горада). Вельмі не хацелася б, каб гэтая ініцыятыва стала рэальнасцю (безумоўна, ідэя кіраўніцтва райвыканкама пра стварэнне новых шляхоў зносінаў і іх паляпшэнне – вельмі добрая і прагрэсіўная, але не тады, калі ў ахвяру прыносіцца выдатны прыклад бруку на беларускіх землях). Заўжды ж можна знайсці нейкі альтэрнатыўны варыянт...

*Канстанцін НАШЧЫНЕЦ,*
*г. Стоўбцы*





**Ад рэдакцыі.** Праблема, узнятая чытачом, значная. Тым больш, гэта не меркаванне аднаго чалавека. Турбуе такая сітуацыя многіх грамадзянаў, і не толькі Стаўбцоўскага раёна, сярод якіх – журналіст і публіцыст-эколаг Валер Дранчук. Ён звярнуўся з Адкрытым лістом да старшыні Мінскага аблвыканкама Сямёна Шапіры, дзе зазначыў:

*«Гэтая мясціна просіцца ў турыстычныя каталогі-даведнікі. Бываючы ў раёнах, Сямён Барысавіч, Вы часта пытаеце ў кіраўнікоў: "Чаму не развіваецe турызм?" Тады спытаю і я, маючы на ўвазе патэнцыйную музейную пляцоўку за Нёманам: "Навошта было садзіць на кол брукаванку – патэнцыйна відавочны аб'ект турызму?" БРУКАВАНКА – ГЭТА КАЛЕННА-РУЧНАЯ РАБОТА НАШЫХ ДЗЯДОЎ, ДАРОГА-МУЗЕЙ, ГАТОВЫ СКАНСЭН. ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ, АЎТЭНТЫКА МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ. УЛАДКАВАНА-ГАРМАНІЗАВАНЫ ЎНУТРАНЫ СВЕТ ЧАЛАВЕКА І ПРЫРОДЫ, ЭКАЛАГІЧНЫ АСЯРОДАК».*

Далей журналіст задаецца пытаннем:

*«Чаму нямецкая фірма збірае кропля да кроплі скарбы* Маёнтка на Суле, *а герастраты ад сённяшняй улады руйнуюць гэтыя ж скарбы ў сябе пад бокам на беразе Нёмана? І ніхто не рупіцца заступіцца – не на абласным, дык хоць бы на мясцовым узроўні! Свайго не бачаць? Паўтаруся: не бачаць помніка матэрыяльнай культуры.*

*24 снежня 2014 года я быў на прыёме ў старшыні райвыканкама Ю.М. Горлава. Усё, што мог, выклаў, давёў пры шматлюдным актыве: ПАКІНЬЦЕ БРУКАВАНКУ, АБЫДЗІЦЕ ГЭТЫ БРУК. ПА ЧАСЕ ТУТ БУДЗЕ МУЗЕЙ... Аднак улада не пачула – ні мяне, ні іншых».*

Напрыканцы В. Дранчук прапаноўвае: *«На месцы пакалечаных прысадаў разбіць новыя, сучасныя, запаліць 100 ліхтароў і адкрыць Музей Брукаванкі, можа, першы ў свеце. Хоць трохі паменшае ганьбы за тое, што Стоўбцы – апошні райцэнтр на Міншчыне, які дагэтуль не мае свайго гістарычнага музея».*

Меней як праз месяц В. Дранчук накіраваў у аблвыканкам заяву, дзе адзначыў: кіраўнік аддзела гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталля Хвір паведаміла, што на падставе Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны міністэрства прыняло рашэнне аб прыпыненні працаў і абавязала Стаўбцоўскі райвыканкам падрыхтаваць адпаведныя абгрунтаванні на міністэрскую Раду па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. У сувязі з гэтым аўтар заявы задае праектоўшчыкам два пытанні: *«Ці прадугледжвалася на стадыі праекта знішчэнне старой брукаванай дарогі і высечка прысадаў (дрэваў) уздоўж дарогі; ці разглядаліся альтэрнатыўныя варыянты пракладкі трасы, каб захаваць гэты кавалак гісторыі і прыроды?». Напрыканцы ж грамадскі актывіст прапануе «ў выпадку, калі рашэнне застанецца ў сіле, пакінуць цэлай і некранутай тэрыторыю, дзе пралягае старая брукаваная дарога, як культурна-патэнцыйны турыстычны аб'ект, якому супярэчаць мэты вытворча-эканамічнага і камунікацыйна-транспартнага выкарыстання».*

Дадамо, што ініцыятыву неабыякавых грамадзянаў падтрымаў і Беларускі фонд культуры. Пры канцы лютага на імя намесніка старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама С.Я. Шэсцеля быў накіраваны ліст, дзе зазначаецца: *«падаецца вельмі лагічнай прапанова сп. К. Нашчынца выкарыстаць гэтую брукаванку, якая карыстаецца папулярнасцю ў турыстаў, для далейшага развіцця турыстычнай інфраструктуры Стаўбцоўскага раёна. (...) Беларускі фонд культуры разам з Дзяржаўным музеем Якуба Коласа можа далучыцца да рэалізацыі гэтай і іншых прапаноў».* Застаецца чакаць вынікаў звароту (праўда, Беларускі фонд культуры не атрымаў адказу, нягледзячы на тое, што тэрмін для яго скончыўся).

*На фота Валерыя ДРАНЧУКА: стары брукаваны шлях; з тлумачэннем аб старых дуплаватых дрэвах, па-дзікунску выпілоўваюць моцныя дрэвы*

## Карціны вяртаюцца

***Нядаўна стала вядома, што Белгазпрамбанк папоўніў сваю калекцыю працамі класікаў нацыянальнай школы жывапісу – Фердынанда Рушчыца і Станіслава Жукоўскага. У прыватнага калекцыянера з Беларусі былі набытыя пейзажы Ф. Рушчыца «Пуня і азярод» (1899) і С. Жукоўскага «Адліга. Свіслацкая пушча» (1935).***



*Ф. Рушчыц. «Пуня і азярод»*

Унёсак Ф. Рушчыца (1870 – 1936) у мастацтва Беларусі, Літвы і Польшчы складана пераацаніць. Менавіта ён арганізаваў у 1919 г. мастацкі факультэт наноў адкрытага тады Віленскага ўніверсітэта. У в. Багданава Валожынскага раёна на Міншчыне знаходзіцца магіла мастака, тут жа плануецца стварэнне мемарыяльнага музея яго імя. Дагэтуль у нашай краіне захоўвалася толькі адна праца Ф. Рушчыца – палатно «Каля касцёла» ў зборах Нацыянальнага мастацкага музея. Белгазпрамбанк знайшоў і набыў у сваю калекцыю другі твор мастака – пейзаж «Пуня і азярод». На гэтым маляўнічым эцюдзе можна ўбачыць ваколіцы Багданава, дзе знаходзіўся радавы маёнтак мастака і дзе ён стварыў лепшыя з сваіх карцінаў.



*С. Жукоўскі.*
*«Адліга. Свіслацкая пушча»*

Працаў С. Жукоўскага (1873 – 1944) у Нацыянальным мастацкім музеі каля сарака. Будучы адным з уплывовых пейзажыстаў пачатку XX ст., Жукоўскі шмат падарожнічаў па Еўропе і Расійскай імперыі, дзе адлюстроўваў прыгажосць тамтэйшых ландшафтаў. Аднак штогод мастак абавязкова прыязджаў на пленэры на Гродзеншчыну, у свае родныя мясціны. Белгазпрамбанк стаў уладальнікам адной з працаў Жукоўскага, прысвечанай прыгажосці паўночнай часткі Белавежскай пушчы. Як сцвярджаюць мастацтвазнаўцы, нават у Польшчы, дзе С. Жукоўскі правёў апошнія дваццаць гадоў жыцця, працы гэтага цыкла амаль не прадстаўленыя ў музеях.

*Алесь СУХАДОЛАЎ*

# Абрады і звычаі Дзісненшчыны

## Вялікдзень

*(святкаваўся тры дні)*

Велікодная Багаслужба, як і тут, на эміграцыі, пачыналася яшчэ перад поўначчу. Роўна ж апоўначы з царквы вырушаў хрэсны ход. У маім радзімым мястэчку, калі святар затрымліваўся перад зачыненымі дзвярыма царквы і пачынаў співаць «Хрыстос уваскрос», а хор паўтараў за ім, дык пры першых акордах хору раздаваўся аглушальны выстрал з мажджэра (самаробнай гарматы для ганаровых выстралаў), і ў неба ляцелі рознакаляровыя ракеты. Калі хрэсны ход уваходзіў назад у царкву, навонкі яе пачыналася хрыстосаванне: людзі віншавалі адно аднаго з уваскрашэннем Хрыста і пры гэтым замянялі трыразовыя пацалункі[1]. На гэты момант вельмі ахвоча чакалі маладыя хлапцы ды вольна з яго карысталі, а дзяўчаты як бы і не наўмысна стаялі грамадкамі ў менш асветленых месцах на цвінтары; пры хрыстосаванні яны звычайна крыху бараніліся, але не зашмат.

Калі Багаслужба канчалася – а трывала яна зазвычай больш за дзве гадзіны, – людзі спяшаліся дамоў, каб хутчэй разгавецца. У адрозненне ад Калядаў, цяпер ужо амаль ніхто не ехаў, а ўсе ішлі пехатой, выключаючы хіба вельмі старых і хворых. Таму, што вярталіся ўсе з царквы перад усходам сонца, дык некаторыя, асабліва моладзь, затрымоўваліся на ўзгорках, каб пабачыць, як гуляе, узыходзячы, сонца. Бо сярод людзей існавала павер'е, што адзін раз на год, а пайменна на Вялікдзень, сонца, узыходзячы, гуляе – рассыпаецца на дробныя часткі, пераліваючыся вясёлкавымі колерамі, і хто гэтага не бачыў, тэй напэўна насіў на душы вялікі грэх. Вось дзеля гэтага – гулянне сонца «бачылі» без выключэння ўсе.

Разговіны – першы скаромны пасілак пасля сямітыднёвага посту – елі ўсе з вялікай ахвотай, захоўваючы пры гэтым пэўны рытуал. Спярша маці стаўляла на стол усё прыгатаванае на свята (тут трэба зазначыць, што там, дзе стол пасвячаўся яшчэ ў Вялікую суботу, гэтая чыннасць сама сабой адпадала); наступна яна раздавала ўсім прысутным па адным асвячаным яйку, а тыя аблуплівалі яго вельмі асцярожна, каб, барані Божа, шалупінне з яйка не звалілася на падлогу (пазней яно збіралася і закопвалася ў зямлю дзесьці ў кутку агарода – там, дзе не хадзяць ні жывёла, ні людзі, каб не таптаць нагамі пасвячанай рэчы). Пасля гэтага бацька ці хтосьці са старэйшых, памаліўшыся, пачынаў з вялікаю павагай есці гэтае яйцо, а скончыўшы, наліваў і выпіваў чарку. Па ім, захоўваючы парадак старшынства, рабілі гэта іншыя сямейнікі; што праўда, дзецям чаркі не давалі, хіба толькі хлапцам-падросткам бацька наліваў паўжартам на дно крышачку гарэлкі. Тады ўжо пачыналі есці ўсе, што хто хацеў і колькі хацеў.

Снеданне, аднак, доўга не зацягвалася; яшчэ раз памаліўшыся, усе выходзілі з-за стала. У гэты час каля дзвярэй ужо раздаваліся галаскі тых, хто прыйшоў па яйка. Пры гэтым яны віншавалі гаспадароў толькі двума словамі: «Хрыстос уваскрос!» – і за гэта атрымоўвалі па яйку кожнаму.

Старэйшыя хлапцы і мужчыны спяшалі на ведамае ўжо ўсім месца, дзе з года ў год адбывалася гульня «ў біткі». Гэта выглядала наступна. Адзін са спаборнікаў выклікаў іншага, і калі тэй гадзіўся, дык выклікаючы павінен быў трымаць сваё яйцо моцна ў кулаку носам (вострым канцом) угару, а выкліканы мусіў злёгку стукаць у яго сваім яйкам, таксама носам. Чыё яйцо пабілася, тэй паварочваў яго пухой (тупым канцом), і ізноў паўтаралася тое самае, што і за першым разам. Пераможцам лічыўся тэй, чыё яйцо заставалася цэлым хоць толькі з аднаго канца; ён забіраў яйцо пераможанага ды ішоў шукаць шчасця далей. Некаторыя старэйшыя мужчыны ўмелі выбіраць вельмі моцныя яйкі, бо ўмелі іх мацаваць. Мацаванне палягала на тым, што гэты ўмелец браў яйцо лёгенька ў тры пальцы і вельмі асцярожна стукаў ім па сваіх зубах; гук, які выдавала яйцо, сцвярджаў, ці яно моцнае, ці не. Але тых, хто меў такія яйкі, добра ведалі ўжо іншыя, і перасцерагалі адзін аднаго, што тэй ці іншы мае мацуна. Іншыя, хоць і рэдка, але рабілі штучна моцныя яйкі, і бяда таму, каму здолелі давесці падобнае ашуканства: яго не толькі праганялі з пляца гульні, а часамі расквашвалі нос, і слава аб ім ішла на ўсю ваколіцу.

Калі ўжо гульцы ў біткі нацешыліся сваімі перамогамі, а пакананыя[2] перахварэлі страты, пачыналася новая гульня – качанне яек. У ёй маглі брацца ўдзел усе аматары яечнага азарту. Што праўда, меншыя гулялі са старэйшымі неахвотна, падазраючы тых – і то часамі зусім слушна! – у круцельстве. А круцельства палягала ў тым, што старэйшыя мелі ў запасе амаль заўсёды два яйкі таго самага колеру, але неаднолькавай формы. Адно з іх было амаль што круглае і каціласся проста, а другое – прадаўгаватае, з вострым носам і шырокай пухой. Такое яйка, скаціўшыся з лубка, адразу вярнула ў тэй бок, у які быў накіраваны нос. Такая штучка лічылася парушэннем, і малышы заўсёды голасна пратэставалі супраць яе, але іх ніхто не слухаў.

Думаю, не будзе лішнім расказаць, на чым палягала гэтае качанне яек. Вось жа дзеля гэтага, па-першае, трэба было мець лубок – кавалак дрэва даўжынёй каля $^3/_4$ метра з выгладжаным ад канца да канца жолабам. Таму, што качанне адбывалася на заваліне пад сцяной хаты, дык лубок апіраўся на падмурак пад такім кутом, каб паложанае на яго яйцо каціласся – але не вельмі хутка – на дол. Выйграваў той, чыё яйцо, коцячыся, дакранала да чужога. Тады ён забіраў яго, а прайграўшы, павінен быў палажыць іншае. Калі ж наступным разам яно не зачаплялася, сваё яйка каціў наступны гулец. Ведама, нікому не хацелася пачынаць гульню першаму, бо небяспека страты яйка была вялікая, а шанцаў на выйгрыш – амаль ніякіх. Дзеля гэтага існавала даволі складаная сістэма мерацца на кій.

Стратныя[3] ў гульні не вельмі гэтым праймаліся і хутка аб гэтым забываліся. У гэты дзень і іншых забаваў не бракавала: напрыклад, кожны, хто гэтага жадаў, мог без перашкодаў званіць у царкоўныя званы колькі хацеў. Гэтым забаўляліся пераважна падросткі...

Калі ж сонца павяртала да захаду, з усіх бакоў пачыналі раздавацца спевы валачобнікаў. Іх зазвычай хадзіла некалькі групаў, але яны заўсёды стараліся не ўваходзіць адна другой у дарогу. Усе яны мелі тэй самы склад: пачынальніка, запявалу, музыку і механошу ды некалькі спевакоў. Спевакі адыгрывалі ў групе далёка не першарадную ролю, бо ў валачобнай песні спявалі пасля кожнае зваротку толькі кароткі і таго самага зместу прыпеў, як, напрыклад: «Хрыстос уваскрос, Сын Божы» або «Хрыстос Сын Божы» ці «Хрыстос уваскрос на ўвесь свет». Галоўную ролю адыгрываў пачынальнік: ад ягонага таленту і памысловасці[4] залежала папулярнасць цэлай групы. Музыка таксама быў важнай фігурай.

За маёй памяццю ў мястэчку з года ў год існавала некалькі групаў валачобнікаў, але галоўнымі з іх былі толькі дзве – Антосева і Гарасімава, назвы якіх паходзілі ад імёнаў іхных праваднікоў-пачынальнікаў. Абедзве групы стала мелі тых самых музыкаў з баянамі. Іншыя ж, менш папулярныя групы спявалі ў найлепшым выпадку пад скрыпку, губны гармонік або зусім насуха[5]. Дзеля абразлівае мянушкі механошы, якога вульгарна называлі дрыстуном, заўсёды існавалі цяжкасці знайсці ахвотніка на гэтую функцыю. З ім даволі лічыліся, і пры падзеле валачобы[6] ён атрымліваў нават большую долю ад радавых спевакоў.

Большай папулярнасцяй, ведама ж, карысталіся тыя групы, якія мелі добрых музыкаў, бо, пераходзячы ад хаты да хаты, спевакі пад іх акампанемент часамі спявалі розныя свецкія песні і прыпеўкі, або і самыя, без спевакоў, музыкі цешылі прыгодных[7] слухачоў такімі мелодыямі, як шырока ведамая Бляхарышына полька.

Змест песняў паасобных групаў мала чым розніўся адзін ад другога. Пачынальнікі дадавалі ад сябе штораз то новыя фрагменты, можа, і простыя ды наіўныя, аднак фрагменты гэтыя глыбака западалі ў душы тых, хто шчыра любіў свой народ. У асноўным песні выхвалялі гаспадара і ягоную гаспадарку, а таксама прасілі Бога і ўсіх святых дапамагчы яму ў ягонай працы. У некаторых дамох, асабліва ў тых, дзе было спадзяванне на больш шчодрае валачобнае, спяваўся яшчэ зварот да гаспадыні, а калі былі ў сям'і дзяўчаты, дык і да дачушак.

А вось прыклад валачобнае песні:

*Як Пан Езус пахвалёны,*
*Пахвалёны дом свянцоны.*
*Гаспадару, слаўны пане,*
*Устань рана, мыйся бела.*
*Мыйся бела, суха трыся.*
*Суха трыся, прыбярыся.*
*Глянь ў ваконца на ўсход сонца.*
*У тваім дварку, як у вянку.*
*У тваім дварку зорка ўпала,*
*На тым месцы царква стала.*
*А ў тэй царкве прастол стаіць,*
*А на прастоле сам Бог сядзіць.*
*Каля Бога ўсе святыя,*
*Рыхтуюцца, чаргуюцца,*
*Каму першаму ставаці,*
*Даці людцам святкаваці,*
*Дый у працы памагаці.*
*Святы Юры – Божы ключнік,*
*Вазьмі ключы залатыя,*
*Сядлай каня варанога.*
*Едзь у поле ў чыстае,*
*Адамкні зямлю, пусці расу.*
*Пусці расу па ўсю вясну –*
*І мокрую, і цёплую.*
*А Мікола, добры пастух,*
*Путай коней, гані кароў,*
*Ды адганяй ваўкоў-звяроў.*
*Святы Пётра, моцны касец,*
*Клепле косы, граблі ладзіць,*
*Колы правіць, вілы ладзіць,*
*Каб на пожні не падгадзіць.*
*Святы Пракоп памагае,*
*Цёмны хмары разганяе.*
*Сушыць сена, канюшыну –*
*Згатаўляе корм на зіму...*

і гэтак далей.

Так перабіралі ўсіх святых, святкаванне якіх прыпадала на вясенні або летні сезон і якім можна было прыпісаць дапамогу селяніну-земляробу.

**Васіль СТОМА**

***(Заканчэнне артыкула будзе)***

*Працяг тэмы. Першыя публікацыі гл. у № 46 за 2014 г. і № № 1, 7, 9, 11, 13 за 2015 г. Друкуецца з захаваннем асаблівасцяў аўтарскай мовы.*

[1] Абменьваліся трохразовымі пацалункамі.
[2] Пакананы – пераможаны.
[3] Стратны – тут: той, хто прайграў.
[4] Памысловасць – удачлівасць.
[5] Насуха – тут: а капэла.
[6] Валачоба, валачобнае – назбіранае валачобнікамі па хатах у выніку валачбы.
[7] Прыгодны – выпадковы, аднаго са значэннаў слова лрыгода – выпадак.

## Велікодны кошык вершаў

Кнігу «Кошык Велікодны» склалі вершы Уладзіміра Сіўчыкава на разнастайныя тэмы: пра святы Каляды і Вялікдзень, пра дзівосны музей камянёў ва Уруччы і цмока, што жыве ў тым мікраараёне, і інш. Між іншым, у раздзеле «Паэтычныя нізкі // З моў далёкіх і блізкіх» друкуюцца пераклады замежных дзіцячых пісьменнікаў Надара Думбадзе, Шадзімана Шаманадзе, Яна Бжэхвы і Дануты Вавілаў.

Вясёлыя і дасціпныя, а разам з тым і павучальныя вершы У. Сіўчыкава праілюстраваныя малюнкамі Алены Карповіч.

**Алесь САЧАНКА**




**Уладзімір СІЎЧЫКАЎ**

### Велікодны кошык

*Нам з сястрой сказала мама Рая:*
*«Сонейка купаецца і грае!*

*З кубка, у якім ляжыць яечка,*
*Умывайцеся, мае сардэчкі!»*

*Соль, ваду і маляванкі ў храме*
*Асвяціла мамка золкім ранкам.*

*– Выбачай, цябе не возьмем,*
*кошка,*
*Не табе падрыхтавалі кошык!*

*На Вялічка для бабулі роднай*
*Мы збіраем кошык*
*Велікодны.*

*Пасху з тварагу, разынак, маку*
*Пакладзем*
*Ды іншыя прысмакі.*

*Наладуемся як след,*
*А потым*
*На аўтобусе паедзем «сотым»...*

*Бабу Ліду тройчы пацалуем,*
*Ад яе «Хрыстос уваскрос!» пачуем,*

*«Уваскрос напраўду!» ёй адкажам*
*І ручнік на кошыку развяжам,*

*Стол накрыем і зацеплім свечку,*
*Прачытаем «Ойча наш»*
*адвечны...*

*Будзем з ёю ў біткі гуляцца,*
*Сочывам, вяндлінай разгаўляцца,*

*Запіваць гарбатай джэм*
*з маліны*
*І расказваць школьныя навіны,*

*Слухаць казкі і развучваць песні*
*Пра Любоў, якая уваскрэсла...*

*(Заканчэнне. Пачатак у № 13)*

# Шаркаўшчына і яе руплівцы

## *Да 75-годдзя раёна*

### За працу і пашана

Да кіраўніцтва калгасамі камуністычная партыя прызначала хоць малаграматных, але вельмі адказных людзей, вялікіх практыкаў. Напрыклад, старшынёй калгаса «Герой працы», затым пасля аб'яднання «Маяк» быў Іван Гудоўскі. Яго вопыт, прывезены з Германіі, вясной «рамантаваць» зрэджаныя пасевы азімых яравымі культурамі, праводзіцца ў раёне і па сённяшні дзень.

Кожны з былых кіраўнікоў раёна пакідаў свой адметны след. Вось што расказаў на сходзе перад калгаснікамі раёна першы сакратар райкама партыі Анатоль Шманцар пра вынікі ў сельскай гаспадарцы за 1966 г.: «Атрымана ў сярэднім па 8,9 цэнтнера зерневых з гектара, 4,6 цэнтнера льносемя і 3,6 – ільновалакна, 229 цэнтнераў караняплодаў і 91,1 – бульбы. На наступны год запланавана атрымаць з гектара: 10,3 цэнтнера збожжавых, бульбы – 95, караняплодаў – 230, 4,1 і 4 – ільнасемя і льновалакна, ачысціць ад хмызнякоў 2 930 гектараў зямель. Надаіць ад кожнай каровы па 1 890 кілаграмаў малака, мець 9 133 каровы і 11 980 маладняку буйной рагатай жывёлы. Намечана пабудаваць 4 новыя школы, 60 жылых дамоў, 5 клубаў, 12 магазінаў, 4 грамадскія лазні, 5 майстэрняў побытавага абслугоўвання,127 калодзежаў».

Наступны кіраўнік раёна М. Сезянеўскі ўсе свае клопаты падпарадкоўваў тром складнікам: выкананне планаў-заказаў дзяржавы; забеспячэнне мясцовага насельніцтва мясамалочнымі прадуктамі, свежай і кансерваванай агароднінай, пладамі, ягадамі; і галоўнае – развіццё сацыяльнай сферы. Да таго, як стаць першым сакратаром Шаркаўшчынскага райкама КПБ, ён узначальваў розныя калектывы і меў вялікі вопыт. За працу ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», двума медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Сёлета М. Сезянеўскаму спаўняецца 80 гадоў. За гады працы першым сакратаром райкама ў раёне было пабудавана да 80 дамоў сацыяльных паслугаў, яны былі ва ўсіх «неперспектыўных вёсках», ва ўсіх 22 гаспадарках – пральні самаабслугоўвання. Прывялі ў парадак вуліцы: усе населеныя пункты, дзе было 20 і больш двароў у вёсках, – заасфальтаваныя; асфальтавыя або палепшаныя дарогі злучалі цэнтры гаспадарак з вёскамі, асфальтаваліся машынныя двары, фермы. Была праведзеная сапраўдная «культурная» рэвалюцыя. Невыпадкова ў 1980-х гг. тут быў арганізаваны рэспубліканскі семінар па добраўпарадкаванні сельскіх населеных пунктаў і ўкараненні прагрэсіўных формаў і метадаў працы сельскагаспадарчай вытворчасці.

У вёсках узнавіліся сялянскія рамёствы, тэхналогіі кансервавання. У калгасе «Прагрэс» адкрылі вяндлярню, імя Гагарына – цэх па перапрацоўцы малака. У суткі выраблялі па 200 кілаграмаў сыру «Адыгейскі», які рэалізоўвалі не толькі ў райцэнтры, але і далёка за межамі раёна. У вёсцы Гарадзец па хатніх рацэптах пяклі хлеб.



*Былы сакратар Шаркаўшчынскага райкама партыі М. Сезянеўскі і былы старшыня калгаса імя Гагарына Н. Протас (2011 г.)*



*Ветэраны ВАВ і працы Шаркаўшчыны. Першы справа А. Шманцар (1967 г.)*

У лістападзе 1976 г. Галоўны камітэт ВДНГ СССР узнагародзіў даглядчыка цялятаў калгаса імя Энгельса У. Валяўку бронзавым медалём і каштоўным падарункам.

У ліпені 1976 г. калгас «Маяк» наведаў першы сакратар ЦК КПБ П. Машэраў. За метад павышэння ўраджайнасці сельгаскультураў па яго рэкамендацыі калгасу была падораная аўтамашына «Волга».

У 1977 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за высокія паказчыкі па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў ордэнам Леніна ўзнагароджаныя трактарыст калгаса «Шлях Леніна» В. Драгун, галоўны аграном калгаса «Маяк» М. Чульба, камбайнер калгаса «Вялікае Сяло» Ч. Шышко, першы сакратар райкама Кампартыі Беларусі А. Шманцар. Ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі атрымалі даярка калгаса «Вялікае Сяло» Л. Кабак і начальнік механічнага атрада саўгаса «Верацеі» В. Краснадубскі.

У лютым 1986 г. дэлегатам на XXVII з'езд КПСС быў выбраны машыніст аднакаўшовага экскаватара ПМК-51 меліярацыі трэста «Полацкводбуд» Э. Камінскі.

### На мяжы стагоддзяў

У 1989 г. калгасы былі ператвораныя ў 26 калектываў інтэнсіўнай працы (КІП). Усё раслінаводства і жывёлагадоўля пераведзеныя на арэндны падрад. Тут цанілася самадысцыпліна і самакіраванне. Напрыклад, два браты Івановы ў калгасе «Усход» доўгі час, нават калі астатнія распаліся, не вытрымаўшы новай сістэмы арганізацыі працы, узначальвалі КІПы. Яны кожную вясну засявалі амаль па дзве тысячы гектараў.

А калгасы «Маяк», «Іскра», саўгас «Гарадзец» перайшлі на кааператыўную дзейнасць. У калгасе «Усход» тры сям'і абслугоўвалі 180 кароваў. Прыкладна 100 сем'яў у раёне працавалі на арэндным падрадзе.

Пры ўступленні на пасаду старшыні райвыканкама Леаніда Клакоўскага змяняюцца падыходы ў працы з кадрамі ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі, аддзелах народнай адукацыі, культуры, спорткамітэце. Як правіла, гэта практычныя семінары на месцах з падрыхтоўкай і правядзеннем канкрэтных мерапрыемстваў, што забяспечвалі нядрэнны канчатковы вынік як у эканамічнай, так і ў духоўнай сферах.

3 кастрычніка 1997 г. адбылася ўрачыстая закладка першага каменя ў падмурак раённай бальніцы. Але толькі 7 лістапада 2012 г. ЦРБ гасцінна расчыніла дзверы, галоўным урачом якой стаў С. Стома.

Чалавек ад зямлі Мечыслаў Морхат, калі пераняў старшынства райвыканкамам, меў вялікі досвед працы ў сельскай гаспадарцы. «Жыццё не стаіць на месцы. Неабходны прыліў новых сілаў, – падкрэсліваў старшыня райвыканкама, – але так званай "ломкі" кадраў не будзе. А патрабаванні будуць прад'яўляцца аднолькавыя да ўсіх, незалежна ад узросту і стажу. Крытэрый ацэнкі – прафесіяналізм, добрасумленнасць, высокая адказнасць, чалавечнасць». Сумесна з Батанічным садам была распрацаваная праграма па азеляненні раёна. Стварылі 13 аграгарадкоў.

Цяпер гэтую нялёгкую ношу старшыні райвыканкама ўсклаў на сябе Мікалай Баговіч. Сёння раён корміць зямля: аграпрамысловы комплекс мае дзесяць адкрытых акцыянерных таварыстваў. Бал ворыва па раёне – 28,6, сельгасугоддзяў – 28,1. 83 працэнты зямель цяжкасуглінiстыя і глiністыя.

Змяніліся ўмовы надвор'я, што адмоўна ўздзейнічаюць на вырошчванне сельскагаспадарчых культураў.

У сельгаспрадпрыемствах вядзецца будаўніцтва новых жывёлагадоўчых комплексаў, абнаўляюцца фермы. На 1 студзеня 2015 г. налічвалася 25 669 галоваў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 9 084 – кароваў. Сельскія працаўнікі імкнуцца паляпшаць поспехі ў жывёлагадоўлі за кошт новых тэхналогіяў і старання ў працы. Шмат зменаў адбылося цягам апошніх гадоў, праведзеныя розныя эксперыменты. Але нязменнымі застаюцца людзі, якія дбаюць аб сваёй зямлі.

*Кацярына СОСНА, г.п. Шаркаўшчына*



*Калгаснікі калгаса імя Сталіна ўбіраюць кукурузу (1960 г.)*



*Фота Кацярыны СОСНЫ*

*Кіраўнікі гаспадарак на Дні працаўніка сельскай гаспадаркі. Пяты справа Л. Клакоўскі*

***Леў Казлоў неаднойчы прадстаўляў урыўкі са сваіх твораў у нашую газету. Мы памятаем, напрыклад, вясёлыя гісторыі з яго кніжкі «З дазволу караля і вялікага князя» з малюнкамі вядомага беларускага мастака Пётры Драчова. Цяпер Леў Раманавіч працуе над вялікай трылогіяй, прысвечанай Радзівілу Сіротку. Яна будзе друкавацца ў трох асобных кнігах: «Нашчадак па мячы», «Рыцар Труны Гасподняй» і «Вобраз Вялікага Княства». З яго дазволу мы публікуем урывак з першай кнігі.***



# Нашчадак па мячы

(Урывак з кнігі)

...Пачатак кастрычніка 1566 года. Рымскія будаўнічыя цуды яшчэ болей упэўнілі маладога Радзівіла ў імкненні стварыць нешта падобнае ў сябе. Галава проста гудзела ад уражанняў. «Вось з чаго трэба браць прыклад, чаго дабівацца». Яму хацелася, забыўшы пра ўсё на свеце, ляцець туды, дамоў, зараз жа брацца за працу, бо перад ім – вось яны, прыклады боскай творчасці. Яго маладое сэрца палахцела агнём, гатовым, здавалася, знішчыць усё заскарузлае і санлівае ў сваім краі.

«Хто, калі не я?» – гэтыя словы ўсё часцей і часцей упэўнівалі яго… Яму ўжо сямнаццаць. Ён – паўнапраўны нашчадак, вольны ад рознага апякунства, а галоўнае – з незлічонымі грашовымі магчымасцямі. Можна страціць галаву, ды яшчэ з такім княжацкім уседазволам. Але гэтая «княская самастойнасць» у апошні час неяк схілялася да прыняцця нейкіх не зусім зразумелых рашэнняў, дзіўнаватых для адукаванага ў пратэстанцкім духу літвіна. «Кароль жа нездарма падсунуў тое пасланне да папы. Падштурхнуў, так бы мовіць, да сустрэчы з тым, хто лічыцца намеснікам Бога на зямлі. Але і з тым, хто валодае ўсім гэтым рымскім хараством. А як жа тады мне цалаваць яго пантофлю?! Дзеля чаго? Каб дазволіў прыехаць да нас розным умельцам? І ніяк не прамінуць пытанні веры… Што ж рабіць? Як жа дагаварыцца?

Зразумела, Рыму вельмі хацелася атрымаць значнага саўдзельніка ў далёкай краіне, ды яшчэ такой хісткай у справах веры. Але пакуль вынік такой сустрэчы патанаў у загадкавай няпэўнасці.

Гэта быў прасторны пакой, накшталт кнігасховішча. Штосьці падобнае знаходзілася і ў лукішкінскім палацы, толькі там – намнога сціплей. Бацька рэдка калі туды заглядваў, затое маці – ледзь не кожны дзень. І брала з сабою маленькага княжыча. Яму вельмі падабалася сядзець за вялізным сталом і разглядваць кнігі з тады зусім незразумелымі знакамі-літарамі. Асабліва яго ўражвалі малюнкі, многія з якіх ззялі золатам і срэбрам. Маці казала, што яны створаныя рукамі сапраўдных майстроў, і трэба быць вельмі асцярожным, каб гартаць тыя фаліянты (так яна іх называла). А хацелася чыркнуць нешта сваё пабач – прыклад перад вачыма! Ды і месца многа – столькі чыстага поля на старонках!

Мікалая Хрыстафора сустрэлі раней, каля яшчэ недабудаванай базылікі Святога Пятра. А да таго, пазбавіўшыся ад суправаджэння прыслугі, каб не было аніякіх сведкаў, ён нагледзеў капітана швейцарскіх гвардзейцаў, якія ахоўвалі Ватыкан, і перадаў каралеўскі ліст. Праз некалькі дзён яму прынеслі пергамінавы скрутак, пачатак якога быў надзейна замацаваны адбіткамі чырвонага воску, з выявай нейкага чалавека, які стаяў па калена ў вадзе і закідваў сетку. Па ўсім відаць, збіраўся лавіць рыбу. Але галоўнае – там быў дазвол на сустрэчу.

У пакой імкліва ўвайшоў нейкі чалавек у белай сутане. Твар яго патанаў у цьмені капюшона, але адтуль бліснулі агеньчыкі вострых і ўважлівых вочак. Незнаёмы, перахрысціўшы госця і кінуўшы на хаду прывітальнае «Vale!», упэўненым крокам накіраваўся да вялікага крэсла з золататканымі пуфамі. Заняўшы там сваё месца, ён адкінуў капюшон, і «Сіротка» нарэшце ўбачыў сівую галаву, прыкрытую белай шапачкай. Бразнуў званочак. З другіх дзвярэй выплылі двое ў чырвоным. Наблізіўшыся, яны схілілі галовы перад тым, хто сядзеў, і пачціва сталі непадалёку.

«Так, гэта і ёсць Папа, Півус, пяты па ліку. А тых кардыналаў я пазнаў: адзін – Камендоні, з якім я сустракаўся ў Аўгсбургу, а другі – вармінскі біскуп Станіслаў Гозіюш, безаглядны прыхільнік Рыма ў Кароне. Бацька часцяком з ім спрачаўся па пытаннях сапраўднай веры, – ацаніў значэнне дзейных асобаў малады Радзівіл. – А магчыма, як блізкі сусед зразумее маё становішча? Прынамсі, польская мова нам добра знаёмая. Хаця, дзякуй Богу, я ведаю лаціну».

Нашчадак нясвіжскага Радзівіла Чорнага наблізіўся да папскага крэсла, прыпаў на калена і, прыўзняўшы край сутаны, пацягнуўся, каб пацалаваць сімвалічна Боскі абутак. Але, о, жуда! Там была звычайная босая нага, ды яшчэ прыцярушаная пылам рымскіх вуліц. «Божа! Я зусім забыў, што папа ў мінулым дамініканец, аскет уласнага прыкладу!» – маланка жаху прарэзала Радзівілаву галаву. Ён бездапаможна акамянеў, не ведаючы, што рабіць.

Абодва кардыналы, адвёўшы вочы ўбок, не маглі стрымаць смяшкі. Півус, уразумеўшы што да чаго, пагрозліва зыркнуў на іх і хуценька працягнуў руку, упрыгожаную вялікім залатым пярсцёнкам. На пярсцёнку красаваўся той самы рыбалоў з пячаткі. Гэта неяк супакоіла маладога госця. Але над працягам далейшай размовы павісла нейкая няўпэўненасць, усе маўчалі.

Нарэшце Півус, які неўзабаве хутка зразумеў, што трэба рашуча прасоўвацца ў размове з гэтым хісткім хрысціянінам, загадаў усім супакоіцца. Прагучала пастарскае слова на лаціне:

– Мы сабраліся для вырашэння вельмі важнай справы. Перад намі – адступнік. Ён імкнецца да пакаяння. «Грэшнік, што каецца, пераўзыходзіць праведніка». Так павучаў нас Хрыстос, – працытаваў Найсвяцейшы і звярнуўся асабіста да Сіроткі:

– Quid prodest?[1]

– Quid Romae faciam? Mentiri nescio[2]. Мне трэба ўпэўніцца, што пры вашых кананічных правілах магчымыя дасягненні. Бо, калі не ісці далей, не абапірацца на навуку, на сваю мову, усім зразумелую...

– Менавіта такіх поглядаў прытрымліваюцца заўжды тыя, хто надаюць жыццёвую моц запаветам Ісуса! – пачуўся раптам новы і ўпэўнены голас. З гэтымі словамі ў памяшканне ўвайшоў рослы, параўнальна малады кардынал. Яго нечаканае з’яўленне аказала на ўсіх нейкае магнетычнае ўздзеянне. Нават пантыфік, здаецца, гатовы быў прыўзняцца, каб вітаць яго.

Сіротка, падобна іншым, уздрыгнуў. «Няўжо сам Барамэа? Так, гэта, напэўна, ён, калі прыпомніць апісанні тых, хто вярталіся з дыспутаў. Яны заўжды прайгравалі яму. І, каб залізаць раны, здзекваліся з яго носа: маўляў, ён мог бы добра паслужыць у якасці тарана грэкам у марскіх сутычках з персамі. Але якая ў ім прамяністая вера! Сапраўдны іезуіт...».

– Наш ордэн Ісуса мае цяпер магчымасць, каб выбіць зброю з рук ворага. Нават выкарыстаць іх зброю…

– Не, не і не! – запратэставаў Гозіюш. – Толькі не іх метадамі. Яны такія ж паганыя і бязбожныя!

Спрэчка збянтэжыла думкі госця, пакуль яшчэ няўпэўненага ў будучай веры дзеля супрацоўніцтва. Ён нерашуча паглядзеў на даглядальніка святога прастола. Півус, відаць, пад уражаннем Гозіюшавых словаў, сустрэў яго позіркам, у якім блiснула вышэйшая інквізітарская справядлівасць. Але ён разумеў, што царкве трэба мяняцца, здаравець, станавіцца побач са сваімі прыхаджанамі. І ў гэтым Барамэа атрымліваў рашучую падтрымку самаго пантыфіка. Нездарма малады кардынал-езуіт насіў мянушку «Папскае вока». Але не «Вочы», паколькі Найсвяцейшы ў рэшце рэшт па праве жадаў мець уласны і незалежны погляд на іншыя з’явы. Таму пантыфік звярнуўся па параду да Камендоні:

– Што на гэта скажаш?

– Я яшчэ ў Аўгсбургу заўважыў нейкую разгубленасць у душы нашага госця. Разам з тым, у яго вялікае імкненне да розных навук. І толькі чыстая вера можа навесці парадак у такой пярэстай сумесі. Сэнс у тым, што ў яго краіне дастаткова многа падобных яму, такіх няўстойлівых...

– Святая інквізіцыя, агонь і меч – зробяць сваю справу ў імя нашай веры! – прамалінейна ўмяшаўся Гозіюш.

– Вось тут я таксама скажу: «Не, не і не!» – у сваю чаргу адгукнуўся Барамэа. – Падобныя метады толькі памножаць шэрагі ерэтыкоў. Людзі павінны шчыра верыць у нашую царкву, якая сее выключна дабро...

Гозіюш зноў замахаў рукамі:

– Я змагу падняць тысячы нашых паплечнікаў, каб навесці парадак у галовах!

Усе паглядзелі на Папу. Той задумаўся, быццам бы нешта вылічваў, і нечакана сказаў:

– Старая рымская прымаўка кажа: «Лепш верыць двум сведкам, што пацвярджаюць, чым тысячы адмаўляючым». Аднак я не ўпэўнены, ці ад чыстага сэрца князь імкнецца зрабіцца сапраўдным каталіком? Ці дастаткова будзе адных словаў? Справай, як кажа наш Барамэа, добрай справай на карысць Усявышняга, ён павінен даказаць гэта. «Вера без справы мёртвай з’яўляецца».

– Ваша Свяцейшасць! – ніяк не мог утаймавацца польскі кардынал. – А што пра існаванне законаў? Яны ж існуюць!

– Законы – тое, што мы пішам! – адмахнуўся ад яго Півус. – Лепш няхай наш госць прызнаецца, чаму яго так пацягнула ў Рым?

«Тут адназначна не скажаш, – задумаўся Мікалай Хрыстафор. – Што, толькі памаліўшыся па сапраўдным абрадзе, з дапамогай іх майстроў, на іх прыкладах… Не, неяк занадта спрошчана… Цікава, як бы паводзіў сябе зараз бацька? Э-э не, ён бы і не наблізіўся сюды. Дык у чым тая ісціна? Дзе яна? Калі нават Понцій Пілат не атрымаў зразумелы адказ. Але зараз перавага на іх баку. Яны ведаюць, што рабіць, а галоўнае – як? А я зусім разгублены. Праўда, наглядзеўся ўсяго, ды і навучыўся нечаму…»

– Мы бачым: князь усё яшчэ разважае, – парушыў цішыню чакання Барамэа. – На яго месцы я паводзіў бы сябе абсалютна таксама. Праўдзівыя словы павінны зыходзіць ад чыстай душы. Але за гэта трэба змагацца, адрынуўшы ўсялякае самалюбства. Нездарма Усявышні прыдумаў Чысцілішча – месца не толькі высокага пакаяння заблукалых душ, якія не ўчынілі цяжкі грэх. А перад вамі менавіта пакуль бязгрэшны чалавек. Толькі яму патрэбнае Чысцілішча на гэтай Зямлі. Ён зараз далёка ад сваёй Радзімы, і не можа атрымаць аніякай парады ад сваіх родзічаў. Але ў нас вучацца яго землякі. Наколькі нам вядома, князь таксама нядаўна быў студэнтам, і, напэўна, захоча ўбачыцца з імі?

Канечне, такое заканчэнне ўсім спадабалася. Адразу стаў відавочны выхад з непажаданай палемікі. Невядомым заставалася толькі канчатковае рашэнне. Тым не менш, Сіротку паведамілі, што аўдыенцыя скончаная.

– Я раней усім даводзіў, што гэты кальвін не кінецца да нас у абдымкі, – з паспешлівай урачыстасцю вымавіў Гозіюш, ледзь за Радзівілам зачыніліся дзверы. – Бачу ў ім належную ахвяру для нашай справы...

– Такая ахвяра нічога не дасць, – заўважыў Камендоні.– Нам патрэбен сапраўдны жывы каталік. Для гэтага трэба цярпенне і час. Цярпенне можа доўжыцца столькі, колькі пажадае Госпад Бог. А вось час не можа чакаць, і цячэ бесперапынна. Нават Бог, аднойчы запусціўшы яго, не можа спыніць. Пазбегнуць стратаў тут немагчыма. Радзівіл з-за свайго княжацкага паходжання можа выпадкова туды патрапіць. Але ў гэтай ракі ёсць берагі. Адзін я бачу сярод нас. Застаецца толькі знайсці другі. І ён будзе хутка знойдзены – на той самай студэнцкай сустрэчы.

– Я згодзен з гэтымі і, асабліва, з тымі словамі, якія мовіў Яго Свяцейшасць, – ужо значна міралюбівым голасам вымавіў кардынал Гозіюш, з чым усе пагадзіліся.

– Выказаліся, чым аблегчылі свае душы. Sub rosa – няхай застаецца паміж намі. Amen! – скончыў сустрэчу Півус, жвава перахрысціўшы прысутных...

***Леў КАЗЛОЎ***

*(Скарыстаныя выява барэльефа М. Радзівіла «Сіроткі» ў нясвіжскім касцёле Божага Цела і партрэт Папы Пія V)*

---

[1] Каму выгадна?

[2] У Рыме я павінен казаць праўду.

Традыцыі і сучаснасць

# На Беларусі Бог жыве?

*«Люблю Беларусь: Беларускі хрысьціянскі хіт'7», Мінск, 2015, «БХД»/«Будзьма»*




Ну вось вам і lucky-seven. Хоць «шчаслівая сямёрка» не зусім хрысціянскі сімвал, але калі серыя «Беларускі хрысціянскі хіт» насамрэч колькасна абагнала музычныя серыі аўдыяэнцыклапедыяў рок-стылістыкі (5 шт.), канцэптуальных супольных праектаў (5), маштабных трыб'ют-альбомаў (4), папулярных CD-складанак «Вольныя танцы» (3), дык як не прыгадаць той сімвал на сёмым выпуску выдання, які атрымаў падзагаловак «Люблю Беларусь»? Паводле зместу яно становіцца ўсё мацней, канцэптуальней, а вось паводле аздобы... Мы ўжо выказваліся пра гэта раней, прыгадайце хоць бы «КГ» №№ 11 і 14 (2010), № 38 (2014), каб адчуць, што да пятага выпуску гэта была серыя, а потым... Дыскі засталіся – серыя знікла. Праўда, зграбнасць модных дыґіпакаў лашчыць ґуст калекцыянера. Але нават шосты дыск серыі так непадобны на сёмы, што пра стройныя першыя пяць ужо й не прыгадаеш.

Любая складанка (нават хрысціянскіх спеваў) найперш прываблівае наяўнасцю зорак. Яны гарантуюць якасць, эмацыйную акцэнтацыю. Наўрад каго не прывабяць імёны й таленты такіх артыстаў, як Вальжына Цярэшчанка (дуэт са Змітром Вінаградавым «Беларусь»), Зміцер Вайцюшкевіч («Беларуская песня» на вершы У. Караткевіча), Ян Жанчак («Сцежка» на вершы Л. Ґеніюш), Алеся Унукоўская («Ты адзіны»), Андрэй Мельнікаў («Дзе мой народ?»), Тацяна Беланогая («Зямля»). Тры апошнія стварылі хрысціянскія песні праслаўлення (у дадзеным выпадку патрыятычнай тэматыкі) на ўласныя вершы:

*Памалюся за цябе – хай прысніцца сон,*
*у якім сонца,*
*Малюся за цябе – хай прысніцца сон,*
*у якім вецер*
*Калыша высокія травы.*
*Памаліся за мяне – у вачах маіх*
*спісаныя сцены,*
*Маліся за мяне – у руках маіх жалезныя вены.*
*Маліся за мяне – я каменне на дарозе.*
*Хай малітвы паляцяць і на небе будуць разам,*
*Зямля не для кахання.*

А прыхільнікі хрысціянскай рок-музыкі з захапленнем паслухаюць тут незабыўны метал-гурт «Tesaurus» («У палоне ілюзіяў» на мае вершы).

Варта дадаць, што складанка «Люблю Беларусь: Беларускі хрысціянскі хіт'7» да наяўнасці сённяшніх зорак прапануе й эфект уваскрэшання прызабытых, бо сярод «невядомых» выканаўцаў мне асабіста кідаецца на вока Віктар Козел з песняй «Чакае Цябе Беларусь». Гэта былы вакаліст залатога складу прыгаданага гурта «Tesaurus», таму адразу слухаем, каб лішні раз адчуць, што ён кідаецца й на слых.

Не ўпершыню сустракаем на дысках хрысціянскай серыі і такія імёны ды назвы, як ансамблі «Подых духу» («Мая краіна» – муз. і сл. В. Гаўруты), «Небасхіл» («Маёй Радзіме» ўласнага аўтарства), Інэса Леаданская («Мой родны кут» на словы М. Шыкуць). Нечакана напаткаў я ў праґраме кружэлкі знакамітага рэпера Vinsenta, вядомая песня «Бог, радзіма, воля» апынулася бездакорна ў тэму.

У жанры рэп-творчасці асабіста для мяне стаў на гэтым дыску яшчэ большым адкрыццём дзіцячы калектыў царквы «Ян Прадвесьнік», прадстаўлены тут сацыяльнай рытмічнай чытанкай «Мы разам»:

*Вы кажаце нам, што мы яшчэ дзеці.*
*Хай так, але як нам без справы сядзець?*
*Мы пойдзем туды, куды вы павядзеце,*
*І зможам дакладна ўсё зразумець.*
*Мы ўсё разумеем, мы ўсё заўважаем,*
*І тое, як моладзь наш край пакідае,*
*Шукаючы шчасця ды лепшае долі,*
*Багацця і славы ды подыху волі.*

Ажно дзве песні прапанавала ў альбом Юля Фралова («Малітва за Беларусь» і «Бог ёсць любоў»). Для яе гэта добры старт – паказаць меладыйны талент свайго голасу; тым больш, калі ён не надта прайграе ў параўнанні з гучаннем таго ж В. Козела (як бы мог сёння гучаць «Tesaurus»!), а мо' і ўдала кантрастуе з траґічным мінорам А. Мельнікава. Хоць 13-ы нумар тут атрымала ейная аўтарская песня (словы і музыка), але нам не да прымхаў:

*Адкрый сваё сэрца – Бог цябе любіць,*
*Ён цябе збавіць і не пакіне...*
*Ён не падмане, ён міласэрны,*
*Ён цябе чуе – даверся яму.*
*Дай сваю руку – пойдзем ўсе разам,*
*Станем пад крыжам Пана і Збаўцы.*

А больш вядомы гурт «Laudans» таксама прапануе два цалкам новыя творы («Малюся за цябе, Беларусь» і «Зорка Бэтлеемска»), хоць ужо мае прамыслова выдадзены свой паўнафарматны хрысціянскі альбом «Завысоказаблізка» (2014). Паводле жанру калектыў бліжэй, бадай, да фолькавых традыцыяў, хоць выконвае і аўтарскія творы С. Бараўнёва, і сучасных незафіксаваных летапісцамі аўтараў.

Асобна варта ўхваліць вяртанне серыі да колісь удала распрацаванай структуры. Відаць, выдаўцы не праіґнаравалі заўвагі крытыкаў на гэты конт. Усе дыскі маюць унікальную праґраму, але заўжды пачынаюцца славутым гімнам «Магутны Божа» М. Равенскага і Н. Арсенневай, а завяршаюцца малітвай «Ойча наш» (якой у шостым выпуску чамусьці не апынулася). Цяпер усё ў закладзеным парадку, хоць унікальнасць гэта не збянтэжыла. Бо заўжды гэтыя абавязковыя творы гучаць ад розных выканаўцаў вельмі па-рознаму, кожны раз пашыраючы спектр эмацыйнага асэнсавання іх вернікамі: тут «Магутны Божа» тонка спявае хор мінскага Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, а малітву «Ойча наш» насамрэч ператварыў у кананічны спеў хор святароў Гродзенскай епархіі. Так што любіце Радзіму сваю – Беларусь і маліцеся за яе, бо, як сказаў вялікі Караткевіч, «на Беларусі Бог жыве».

**Вітаўт МАРТЫНЕНКА, музычны крытык**



*Выступае гурт «Laudans»*

## Без мовы няма народа...

XXI стагоддзе – стагоддзе самых цесных, шырокіх кантактаў і культурных зносінаў паміж краінамі, народамі і людзьмі. І кожны адукаваны чалавек проста абавязаны ведаць адну ці некалькі замежных моваў. Але калі ён не ведае ці цураецца роднай, то не толькі не можа лічыцца адукаваным і культурным чалавекам, а становіцца ў такім выпадку падобным на дрэва з пашкоджанымі ці падсечанымі каранямі, якое неўзабаве без жыватворнай глебы засыхае і гіне...

Родная мова – гэта тая глеба, на якой расце, каласіцца і квітнее кожная нацыя. Без роднай мовы і культуры народ ператвараецца ў бязлікае насельніцтва, якому, па сутнасці, усё роўна, што адбывалася, адбываецца і што будзе адбывацца на той зямлі, на якой яно жыве...

Без мовы няма нацыі, няма народа, няма дзяржавы...

Тэма роднай мовы, яе багацця, чысціні, сферы ўжывання, беражлівага ці абыякавага стаўлення да яе – вельмі тонкая і балючая тэма для любога народа, нават самага вялікага, бо мова ёсць душа народа. І ад таго, як мы ставімся да сваёй роднай мовы, з любоўю і клопатам ці, наадварот, бяздушна і абыякава, залежыць нашая будучыня... У гэтай сувязі хочацца прывесці выказванне выдатнага рускага пісьменніка К. Паўстоўскага: *«Па стаўленні кожнага чалавека да сваёй мовы можна дакладна меркаваць не толькі аб яго культурным узроўні, але і аб яго грамадзянскай каштоўнасці. Сапраўдная любоў да сваёй краіны немагчымая без любві да сваёй мовы. Чалавек, які абыякавы да роднай мовы, – дзікун. Ён шкодны па сваёй сутнасці, таму што ягоная абыякавасць да мовы тлумачыцца поўнай абыякавасцю да мінулага, сучаснага і будучыні свайго гарода».*

Мае развагі на гэтую і іншыя тэмы, пранізаныя горыччу і болем, трывогай, сумненнем і спадзяваннем, занатаваныя ў паэме «Лілея на цёмнай вадзе» (выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 2001 г.).

І вось як працяг той даўняй споведзі – цыкл вершаў «Нібыта ветрам выдзьмула душу...», паэтычныя радкі якога, спадзяюся, будуць блізкія ўсім, каму неабыякавы лёс роднай мовы, Айчыны, народа...[1]

**Міхась БАШЛАКОЎ**

[1] У «Краязнаўчай газеце» друкуецца са скарачэннямі (вершы адабраў і ласкава прадаставіў для публікацыі аўтар). – **Рэд.**




### Без сумлення няма паэта...

*Без сумлення няма паэта...*
*Калі Бог табе талент даў,*
*Трэба помніць заўжды*
*пра гэта,*
*Бо паэзія не для забаў...*

*І метафары ўсе, і рыфмы*
*Не крануць сваёй навізной,*
*Калі хібы душы, як рыфы,*
*Недзе бачацца за страфой...*

*У паэзіі слоў няшчырых*
*Не бывае... Не можа быць!..*
*Кожны гук у нябеснай ліры,*
*Як агалены нерв, крычыць...*

*І хай лірык ты летуценны –*
*Ты адказны за кожны крок...*
*Будзь, радок мой,*
*заўжды сумленны,*
*Будзь праўдзівы, прашу,*
*радок.*

* * *

*Каму патрэбны мае радкі –*
*Радкі, не чытаныя нікім?*

*Маёй Айчыне?..*
*Майму народу?..*
*Душу сціскае туга-маркота...*

*Іду... Не знаю, куды дарога...*
*Шапчу малітву*
*сваю да Бога...*

*І ўсё павольней,*
*стамлёней крокі...*
*І так мне горка,*
*так адзінока...*

* * *

*Не знае мовы мой народ,*
*Народ мой вершы*
*не чытае...*
*А я ўсё роўна кожны год,*
*А я ўсё роўна*
*іх складаю...*

*Другія кінулі даўно:*
*Маўляў, якая ў тым выгода?*
*Ні ганарару не відно,*
*Ні беларускага народа...*

*Народ без мовы –*
*не народ...*
*Такі народ, як дождж,*
*праходзіць,*
*Знікае, як увесну лёд...*
*Без глебы зерне*
*не ўзыходзіць...*

*Без глебы жыту не рунець...*
*А нашы душы –*
*як пустыня...*
*Хіба бязродным зразумець,*
*Што мова родная –*
*святыня?!.*

*Народ, прачніся, не маўчы,*
*Скажы нарэшце*
*сваё слова...*
*Крычаць і кружаць крумкачы*
*Над нашым лёсам*
*палыновым...*

*Ну, нельга ж вечна піць,*
*скакаць,*
*Быць скамарохам...*
*Божа любы!..*
*Давай жа мову ратаваць...*
*Не аддадзім яе на згубу...*

**(Працяг будзе)**

## Красавік

**20 – Лятун Уладзімір Міхайлавіч** (1935, Уздзенскі р-н – 2001), скульптар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1999) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Мархель Уладзімір Іосіфавіч** (1940, Стаўбцоўскі р-н – 2013), літаратуразнаўца, даследчык беларускай літаратуры XIX ст., беларуска-польскіх літаратурных сувязяў, паэт, перакладчык – 75 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Вуль Ялегі Пранціш** (сапр. **Карафа-Корбут Элігій Францішак Маўрыкіевіч**; 1835, Віцебск – 1880), паэт, удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. – 180 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Дзянісаў Уладзімір Мікалаевіч** (1955, Мінск), архівіст, краязнаўца, гісторык культуры, ганаровы архівіст Беларусі – 60 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Лаўроў Георгій Сцяпанавіч** (1910, Петрыкаўскі р-н – 1993), акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1961) – 105 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Казько Віктар Апанасавіч** (1940, Калінкавічы), пісьменнік, кінасцэнарыст, лаўрэат прэміі імя М. Астроўскага (1975, Расія), прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1977), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1982) і Літаратурнай прэміі імя Б. Палявога (1990, Расія) – 75 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Фалькоўскі Якаў Забядэвуш** (1775, Беласточчына – 1848), асветнік-дабрачынец, адзін з пачынальнікаў навучання глуханямых дзяцей на мове жэстаў у Беларусі і Польшчы – 240 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Анішчык Аркадзь Аркадзьевіч** (1945, Навагрудак), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва – 70 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Раённы музейны комплекс Напалеона Орды** (Іванаўскі р-н; 2000) – 15 гадоў з часу заснавання.

**27 – Арганізацыя Аб'яднаных Нацый** (ЗША; 1945), міжнародная арганізацыя, створаная для падтрымання міру, бяспекі і развіцця супрацоўніцтва паміж усімі краінамі, – 70 гадоў з дня прыняцця Беларусі ў склад членаў-заснавальнікаў.

**27 – Данцыг Май Вольфавіч** (1930, Мінск), жывапісец, народны мастак Беларусі (1995), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1973), лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968) – 85 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Казіміроўскі Саламон Савельевіч** (1915, Бабруйск – 2011), рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968) – 100 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Макараў Барыс Паўлавіч** (1915, Расія – 1991), спявак, заслужаны артыст Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Малішэўскі Эдвард** (1875, Польшча – 1928), польскі гісторык, бібліёграф, аўтар артыкулаў і манаграфій, прысвечаных падзеям паўстання 1863 – 1864 гг., краязнаўчых прац, у т.л. даведнікаў па Гродзенскай, Мінскай і Віленскай губернях – 140 гадоў з дня нараджэння.

**29 – Віленскі музей старажытнасцяў** (Вільня; існаваў у 1855 – 1914) – 160 гадоў з часу заснавання (адкрыты 01.12.1856 г.).

**30 – Кміта-Чарнабыльскі Філон Сямёнавіч** (1530 – 1587), ваенны і палітычны дзеяч ВКЛ, аўтар эпісталярных твораў, якія з'яўляюцца помнікам старажытнабеларускай літаратуры, – 485 гадоў з дня нараджэння.

**30 – Позняк (Пазняк) Вячаслаў Аляксандравіч** (1940, Мінск), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва – 75 гадоў з дня нараджэння.

### *У тэатры «Зьніч»*

**13 красавіка** для дзетак будзе ісці лялечная пастаноўка **«Граф Глінскі-Папялінскі»** паводле п'есы Артура Вольскага. Аўтар сцэнічнай версіі і выканаўца – Вячаслаў Шакалідо.

Увечары на сцэне монаспектакль **«Нобіль – Барвяны Уладар»** паводле аповесці Уладзіміра Караткевіча «Сівая легенда». Аўтар сцэнічнай версіі і выканаўца – заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Шэлестаў.

**16 красавіка** ў Малой зале Белдзяржфілармоніі імя Р. Шырмы (абанемент «Вясёлая каруселя») будзе ісці дзіцячы спектакль **«Мой Маленькі прынц»** паводле аповесці Антуана дэ Сент-Экзюпеперы і вершаў П'ера Беранжэ ў перакладзе Ніны Мацяш. Выканаўца – Раіса Астрадзінава, аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева.

**20 кастрычніка** маленькія гледачы змогуць убачыць лялечны монаспектакль **«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»** па п'есе Лявона Мікіты, які выканае Леанід Сідарэвіч.

У той жа дзень для дарослых гледачоў Мікалай Лявончык пад музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай прадставіць паэтычны монаспектакль **«Не праклінай, што я люблю...»** паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева.

**27 красавіка** паэтычны монаспектакль **«Прыпадаю да нябёс»** паводле вершаў Яўгеніі Янішчыц у выкананні заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Ларысы Горцавай. Аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай.

*Спектаклі праходзяць у Тэатральнай зале культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15-й гадзіне, дарослыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне: 331-75-53.*

### *Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 13*

***Уздоўж***: **1**. Пралеска. **4**. Званочак. **9**. Вянок. **11**. Зямля. **13**. Каравай. **14**. Суп. **16**. Сок. **17**. Неба. **18**. Акын. **21**. Ноч. **22**. Тон. **23**. Дзядуля. **27**. Бекон. **29**. Секач. **30**. Талісман. **31**. Вяснушкі.

***УПоперак***: **1**. Певень. **2**. Енк. **3**. Кура. **5**. Вада. **6**. Ніз. **7**. Княжна. **8**. Два. **10**. Наследнік. **12**. Макрычнік. **15**. Плашч. **16**. Старт. **19**. Сейбіт. **20**. Скачкі. **24**. Зіма. **25**. Дух. **26**. Ляля. **28**. Нос. **29**. Сон.

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**НАРО́ДНАЯ ХАРЭАГРА́ФІЯ** – *(заканчэнне артыкула)*. Так здарылася, напр., з беларускай «Трасухай» – у першаснове тыповым народным танцам, які ў XIX ст. зліўся з полькай і далучыў яе назву да сваёй. «Трасуха» пераняла ад полькі тыповыя для яе вярчэнні, а полька – характэрнае ўстрэсванне верхняй часткі корпуса і рук, прытупы. Беларускія полькі багатыя на музычныя і харэаграфічныя малюнкі, вызначаюцца ладавай і інтанацыйнай разнастайнасцю, здольныя перадаваць цэлую гаму мажорных настрояў. Амаль для ўсіх варыянтаў абавязковыя полечныя вярчэнні або іх мадыфікацыі, якія камбінуюцца з інш. элементамі нацыянальнай лексікі: прытупамі, кавыралачкамі, дробушкамі, прысюдамі, адкіданнем назад сагнутых у каленях ног, розныммі, у т.л. высокімі, падніманнямі партнёршы і г.д. Пра разнастайнасць лакальных і стылістычных варыянтаў полек сведчаць самі іх назвы: «Гайкаўская», «Барысаўская», «Віцяблянка», а таксама «Рассыпуха», «Шморгалка», «Сядуха», «З прысюдамі», «Драбней маку», «Адбіянка» і інш.

Чацвёртую групу танцавальнага жанру ўтвараюць гарадскія побытавыя танцы, а таксама створаныя на музычнай аснове папулярных песень («Падэспань», «Вянгерка», «Лезгінка», «Месяц», «На рэчаньку», «Лысы», «Субота» і інш.). Некаторыя з іх прыйшлі ў беларускую вёску яшчэ ў канцы XIX ст., калі пачалі пашырацца «модныя» бальныя аранжыроўкі народных танцаў. Асабліва вялікія змены ў танцавальнай творчасці народа адбыліся ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. Амаль па ўсёй Беларусі пашырыліся ў гэты час пэўныя ўзоры бальных і побытавых танцаў, фальклорныя танцы гарадскіх ускраінаў і суседніх народаў, клішэ з заходняй харэаграфіі. Старадаўні танцавальны пласт амаль паўсюдна замяніўся новым, складзеным з танцаў, сканструяваных паводле новых стандартаў. Ім уласцівая своеасаблівая «блочная» канструкцыя, абмежаваная колькасць рухаў. Паводле іх узору, па створаным харэаграфічным стэрэатыпе трансфармаваліся і асобныя традыцыйныя беларускія танцы, што жывуць побач са старадаўнімі.

Асобны жанр танцавальнага беларускага фальклору ўтвараюць сольныя імправізацыйныя танцы, у якіх адсутнічаюць вызначаны парадак фігураў, абавязковая іх паўтаральнасць, строгая ўзаемасувязь паміж партнёрамі. Кожны ўдзельнік свабодна імправізуе, выказваючы ў разнастайных рухах свой настрой, пачуцці. У беларускім танцавальным фальклоры нямала танцаў, што выконваюцца ў народным побыце не толькі ў масавым, але і ў сольным варыянце («Лявоніха», «Бычок», «Шавец», «Мікіта», «Таўкачыкі», «Казачок», розныя скакухі і г.д.). Вялікай колькасцю сольных танцаў-імправізацыяў папоўнілася беларуская харэаграфія ў пачатку XX ст., калі ў побыт народа ўвайшлі «Сербіянка», «Сямёнаўна», «Страданні», «Матлёт» і інш. гарадскія побытавыя танцы. У індывідуальным танцы характар народа і духоўны свет асобнага выканаўцы раскрываюцца асабліва ярка і поўна. Кожны танцор мае свае прыёмы, манеру, па, «выхадку». Выканаўчаму майстэрству танцораў з народа ўласцівая шчодрая самааддача, першасная сіла пачуццяў, непасрэдная захопленасць. Для сольных танцаў характэрнае цяпер частае суправаджэнне рухаў кароткімі, пераважна чатырохрадковымі прыпеўкамі, якія могуць выконвацца з любымі танцамі і ствараццa на хаду, імправізавана. Прысвечаны найчасцей любоўнай тэматыцы, яны закранаюць розныя бакі жыцця, вызначаюцца надзённасцю, аптымізмам, дасціпнасцю.



*«Лявоніха»*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.
Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by
З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 09.04.2015
Газета надрукавана ўдрукарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 239.
Тыраж 904 асобнікі.